Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА і ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

Год выдання XVII-ы

№ 29 (577)
Субота, 26 верасня 1964 г.

Цана 1 кап.

## 23 верасня з Уральскай вобласці вярнуліся нашы студэнты, што працавалі на цалінных будоўлях. Гарачае студэнцкае прывітанне ўдзельнікам цаліннага семестра!

## Ідуць справаздачы і выбары

### Хімфак

17 верасня адбыўся справаздачна-выбарчы сход у партыйнай арганізацыі хімічнага факультэта. З дакладам выступіў сакратар партарганізацыі факультэта В. Ф. Цікавы.

Уся дзейнасць партыйнай арганізацыі хімфака, сказаў ён, за справаздачны перыяд была накіравана на ажыццяўленне рашэнняў XXII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, чэрвеньскага і снежаньскага (1963 г.) Пленумаў ЦК КПСС. У адпаведнасці з законам аб сувязі школы з жыццём партыйная арганізацыя факультэта прыкладала ўсе намаганні да таго, каб выхоўваць высокакваліфікаваных спецыялістаў-хімікаў, узброенных ведамі марксісцка-ленінскай навукі.

У ходзе спрэчак камуністы абмеркавалі работу партыйнага бюро факультэта, адзначылі, што партарганізацыя дасягнула значных поспехаў у сваёй рабоце, у вучэбна-выхаваўчай і палітыка-выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта.

Партыйны сход прыняў разгорнутае рашэнне, накіраванае на далейшае паляпшэнне выканання задачы, якая стаіць перад факультэтам у справе падрыхтоўкі кадраў хімікаў для народнай гаспадаркі рэспублікі.

Сход выбраў новы склад бюро з сямі чалавек. Сакратаром партыйнай арганізацыі факультэта стаў ст. выкладчык **М. П. Крывашэеў**, намеснікам сакратара — дацэнт **В. Р. Шлык**.

### Юрфак

Адбыўся партыйны сход таксама на юрыдычным факультэце. Цяпер партыйную арганізацыю факультэта ўзначальваюць дацэнт **В. А. Шкурко** (сакратар), дацэнт **А. В. Дулаў** і студэнт **С. Е. Падымака** (намеснікі сакратара). Усяго ў склад бюро ўвайшлі дзевяць чалавек.

### Гістфак

У мінулы панядзелак адбыўся справаздачна - выбарчы прафсаюзны сход прафесарска-выкладчыцкага складу гістфака. З дакладам выступіў старшыня прафбюро А. П. Ігнаценка. Грунтоўна паказаў ён работу арганізацыі, яе ўплыў на ўсе бакі жыцця факультэта. Вялікую дапамогу аказвалі прафбюро камісіі. Як правіла, яны глыбока ўнікалі ў вытворчую дзейнасць, выступалі з каштоўнымі прапановамі, якія потым ажыццяўляліся разам з бюро, дэканатам факультэта.

Сапраўды, дакладчыку было аб чым расказаць. Аднак прафсаюзная арганізацыя яшчэ не ўсё зрабіла для таго, каб жыццё на факультэце біла крыніцай. За гэта выступіўшыя ў спрэчках Л. С. Абецадарскі, Г. М. Ліўшыц і іншыя крытыкавалі бюро зусім справядліва. Каштоўныя прапановы ўнеслі члены прафарганізацыі Р. А. Нікольская, Д. Б. Мельцэр і іншыя.

Сход абраў новы склад бюро і дэлегатаў на агульнаўніверсітэцкую прафсаюзную канферэнцыю.

## Байцы з „Алгабаскага“

Здаецца, гэта было зусім нядаўна. Ідзе пасяджэнне камітэта камсамола, на якім зацвярджаюцца камандзіры саўгасных студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Пытаюся ў Вані Цвірко, студэнта 2-га курса фізфака: «Ваня, справішся? У цябе ж нялёгкая задача. Мы табе прапаноўваем кіраваць калектывам у 60 чалавек. Усе яны студэнты першага курса, людзі, якіх ты ўвогуле яшчэ не ведаеш».

— Пастараюся!

З таго дня ў Вані пачалася нялёгкая, карпатлівая праца. Маса спраў — тэрміновых і важных. Нарэшце, створаны штаб атрада, падабраны брыгады, майстар. Скамплектаваны і атрад. Прычым не ў 50 чалавек, як дамоўлена ў дагаворы, а ў 63 чалавекі. Вельмі ўжо добрыя хлопцы і дзяўчаты падабраліся. Ці ж адмовіш?

Напярэдадні ад'езду па рашэнню рэспубліканскага падрыхтоўчага цаліннага штаба мяняецца дыслакацыя. Атраду рэкамендавана ехаць у саўгас «Алгабаскі» Чапаеўскага вытворчага ўпраўлення. Саўгас зусім малады, створаны год таму назад. Вада тут прывазная, месца для купання няма, вакол стэп, базы забеспячэння далёка. Ёсць над чым задумацца. Але камандзір зноў дае «Дабро!» ужо ад імя атрада.

І вось атрад прыбыў да месца прызначэння.

Назаўтра ў абласны штаб ляціць тэлеграма Вані Цвірко з «Алгабаскага»: «Няма будаўнічых матэрыялаў. Работу распачаць не можам». Услед за тэлеграмай у штаб прыязджае і сам камандзір атрада. Нельга было ўстаяць перад яго напорыстасцю. Прыйшлося адкласці іншыя справы і падключыць да Вані забеспячэнцаў з абласнога штаба. Ён не паехаў з Уральска да таго часу, пакуль у «Алгабаскі» не былі адпраўлены будматэрыялы.

Канец ліпеня... Прайшло тры тыдні працы студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Пад'язджаю да саўгаса «Алгабаскі». Ужо вечарэе. Пытаюся ў мясцовага жыхара: «Ці далёка да Верхняга Валогіна?». Гэта там размесціўся студэнцкі будаўнічы атрад «Аэліта».

— Ды не, зусім побач, кіламетраў сто, — адказвае той і паказвае кірунак.

Праліўны дождж размачыў стэпавыя дарогі, і нашаму газіку прыйшлося некалькі разоў буксаваць. Пад'ехалі да лагера «Аэліта» ужо за поўнач. Але што гэта такое? Гарыць вялікі касцёр, у лагеры шум, нейкія спрэчкі. Хоць сёння і нядзеля, але ж заўтра працоўны дзень. Парушаецца распарадак дня.

Але камандзір тут не прычым. Атрад толькі што прыехаў ад сваіх суседзяў — фізікаў другога курса, што працуюць у саўгасе «Першамайскі». Адбылася таварыская сустрэча па футболу, у якой першамайцы перамаглі з лікам 5:0. Разгром! Трэба мяняць ігракоў, узмацніць трэніроўкі. Такі быў вывад.

Панядзелак. 6 гадзін раніцы. Пазыўныя горна, і лагер ажыў. 7 гадзін — лінейка. Гэта своеасаблівы «баявы разлік». Пастаўлены задачы на дзень, брыгады разыходзяцца па ўчастках.

Разам з камандзірам і майстрам атрада Эдзікам Васюценкам абходзім будоўлі. У атрадзе пяць брыгад. Адна з іх праз два дні ўжо здае ў эксплуатацыю зернеток. І гэта не здзіўляюча, бо саманшчыкі робяць па 400—450 цаглін у дзень пры норме 200—250.

На нашы пытанні адказ адзін: «Настрой выдатны. Дапамагайце будматэрыяламі. А мы не падкачаем». Выдатны настрой і ў «байцоў» іншых брыгад. Усюды кіпіць дружная праца.

14 жніўня. Пасёлак Чапаева. Я прыехаў сюды на нараду нампалітаў саўгасных студэнцкіх атрадаў. Да пачатку нарады шмат часу, і я знаёмлюся з вытворчай дзейнасцю раённага атрада. Падведзены вынікі першага месяца работы атрадаў. «Турнірную табліцу» па асваенню капіталаўкладанняў на аднаго чалавека ў дзень узначальвае саўгас «Алгабаскі». 34,1 рубля на аднаго «байца» пры норме 19 рублёў. Ніхто з раённага атрада не абыйшоў іх, ды і ў вобласці зусім мала хто асмельваўся раўняцца з алгабасцамі.

25 жніўня. Працаўнікі вобласці прыступілі да здачы хлеба дзяржаве. Пры плане 36 мільёнаў пудоў яны абавязаліся здаць 73 мільёны. І ў гэтай справе атрад «Аэліта» вызначыўся. Нядзельнікі, рамонт мастоў, дарог, рэйды камсамольскага пражэктара...

А раней, 20 жніўня, алгабасцы выканалі дагаворныя абавязацельствы і сталі на ўдарную студэнцкую працоўную вахту. Было вырашана асвоіць па 2 тысячы рублёў капіталаўкладанняў на кожнага члена атрада. Што ж, пры плане 1100 рублёў гэта добра.

Праўда, не ўсё ішло гладка. Ване Цвірко прыходзілася выязджаць у Свярдлоўск і іншыя гарады, каб на месцы разабрацца з пастаўшчыкамі. Затое дэталі дамоў прыйшлі ў саўгас дакладна ў тэрмін, работа не затрымалася.

Высокую ступеньку ў сацыялістычным спаборніцтве ва Уральскім абласным студэнцкім атрадзе занялі алгабасцы. І гэта вынік іх самаадданай працы.

**Іосіф БЯЛЬКОВІЧ,**

**камісар Беларускага студэнцкага будаўнічага атрада, студэнт 3-га курса гістарычнага факультэта.**

## ДЭБЮТ

**З Міхасём Дэкань мы пазнаёміліся на ўніверсітэцкім вечары дружбы з замежнымі студэнтамі. На сцэну нетаропна выйшаў невысокі чарнявы юнак, і мала хто з прысутных заўважыў, што ён крыху хваляваўся. А хвалявацца сапраўды было чаго. Выступленне Міхася на вечары было першым у яго студэнцкім жыцці. Ён адзін з тых, хто свой жыццёвы шлях прайшоў хоць і праз невялікія, але складаныя выпрабаванні.**

**Школа, завод, армейскае падраздзяленне, універсітэт. Здаецца, шэраг жыццёвых вех не такі ўжо вялікі, але з кожнай з іх звязана нямала падзей, поспехаў, творчых узлётаў.**

**Спяваць Міша любіў з дзяцінства. І калі прыйшоў у армію, для яго было не столькі жаданнем, колькі неабходнасцю. І ён стаў актыўным удзельнікам і арганізатарам салдацкай мастацкай самадзейнасці.**

**Сёлета ён паступіў на першы курс аддзялення журналістыкі. Адным з першых сярод першакурснікаў Міхась Дэкань запісаўся ў харавы калектыў універсітэта.**

**...Доўга апладыравала яму зала. Гэта было прызнаннем поспеху.**

**А. ЯРОХІН.**

## ПЕРШЫ ЧЭМПІЁН

Многія аматары спорту былі, пэўна, нямала здзіўлены, прачытаўшы афішу: «Водныя лыжы. Першынство БССР. Упершыню ў Мінску».

У сонечны і цёплы нядзельны дзень назіралі многія мінчане за цікавай спартыўнай барацьбой. У першым асабістым першынстве рэспублікі па водна-лыжнаму спорту ўдзельнічалі 26 спартсменаў. Яны змагаліся за залатыя медалі чэмпіёнаў у слаламе на адной лыжы, на двух лыжах і ў двухбор'і.

У мужчын у слаламе на двух лыжах удзельнічалі 18 спартсменаў. Спартсмены павінны былі не толькі пераадолець трасу, не закрануўшы кантрольныя буі, але і зрабіць гэта прыгожа, тэхнічна, што таксама ўваходзіла ў ацэнку. Два ўдзельнікі — студэнт фізфака нашага ўніверсітэта Віктар Наважылаў і майстар спорту па водна-маторнаму спорту студэнт БПІ Яўген Радзько набралі аднолькавую колькасць ачкоў. І толькі трэці перазаезд выявіў першага чэмпіёна рэспублікі. Ім стаў Віктар Наважылаў. На трэцім месцы аказаўся яго брат Яўген— трэнер зборнай рэспублікі па водна-маторнаму спорту.

Затое ў слаламе на адной лыжы перамог Я. Наважылаў, а Віктар стаў другім прызёрам. Па суме двухбор'я Віктар таксама ўступіў першае месца свайму брату. Яны заваявалі шэсць медалёў з дзевяці. Выдатна!

**С. ЛУК'ЯНЧЫКАЎ.**

**Цікава і змястоўна праходзяць лекцыі ў студэнтаў-журналістаў па прафілюючых прадметах. Нярэдка да іх у аўдыторыю прыходзяць вядучыя работнікі рэспубліканскага друку. Вось і на гэты раз лекцыю па курсу тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку прачытаў рэдактар «Чырвонай змены» Міхась Андрэевіч Суша.**



**На здымку: М. А. Суша (справа) пасля лекцыі гутарыць са студэнтамі 2-га курса У. Коўцікам і К. Хацяшовым.**

Фота студэнта Ул. КАКОШКІ.

## Апладысменты... у падвале

*Хто з вас, сябры. не быў юбілярам? Прыемна, калі таварышы па вучобе або па працы віншуюць цябе з важнай падзеяй, знамянальнай датай у жыцці. Напрыклад, з днём нараджэння.*

*Дарэчы, «прыемна» — не тое слова. Давер'е сяброў, іх цёплыя словы акрыляюць, даюць новыя сілы. Хочацца працаваць яшчэ больш, лепш. Мы напомнілі гэтую ісціну толькі таму, што гэтымі днямі адбыўся, мякка кажучы, здзіўляючы выпадак. Выпадак рэдкі, выключны.*

*На сходзе адміністрацыйна-гаспадарчай часткі ўніверсітэта ўшаноўвалі паважанага работніка з выпадку яго пяцідзесяцігоддзя. Юбіляру ўручылі Ганаровую грамату, падарунак за плённую працу. Гучалі апладысменты, адбіваючыся ад паўсценных сцен... падвала. Так, так, самага сапраўднага падвальнага памяшкання. Гэтае месца выбрала адмгаспчастка, каб выказаць сваю павагу да юбіляра. Нічога не скажаш, «выбралі»!..*

*Даніла ШЫЛА.*

# У СЭРЦЫ ЖЫВЕ НЕСПАКОЙ...

На чарговым пасяджэнні літаб'яднання «Узлёт», што адбылося ў аўторак, абмяркоўваліся новыя вершы студэнтаў. Радасна адзначыць, што на ім было людна ад першакурснікаў і што старэйшыя іх таварышы дружна ўключыліся ў абмеркаванне. Добрае ўражанне зрабілі вершы Мар'яна Дуксы, Галіны Панько, другакурснікаў Уладзіміра Дзюбы, Аляксандра Нікалайчанкі.

Сёння знаёмім вас з некаторымі вершамі нашых гурткоўцаў.

**Мар'ян ДУКСА**
(1 курс аддз. беларускай мовы і літаратуры)

## Дарога

Заўжды ад здранцвення ачнуся
І роспачы знікне трывога,
Калі ўдалячынь Беларусі
Мяне пакалыша дарога.
Здрыгнецца аўтобус блакітны
І коціць з крутога пакату.
А ў вочы плывуць ракіты
І прыдарожныя хаты.
А сэрца жадае спешна
Нырнуць у блакіт на узгорку.
З суседам, як з сябрам найлепшым,
Распачынаю гаворку.
А ніва ад краю да краю
Спявае пра мір каласамі.
Сыходжу —
І кніжку хаваю
Напоўненую адрасамі.
А сэрцу няма унімку —
І радасць, і сум са мною,
Таму што на кожным прыпынку
Я расстаюся з раднёю.

## Першы дымок

Ён узвіўся
Калматы, блакітна-сівы.
Ён упарта імкнецца ўвысь,
Як жывы.
Я спыніўся.
Стаю.
Першы дым!
Першы дым!
Прагна вочы ўзняў
І сачу я за ім,
Нібы трэба ў бясконцы
Адправіцца свет
І за ім уздымацца
Паволі услед.
Першы дым!..
Прыпыніся, старэнькі дзядок,
Паглядзі,
Як прыгожа віецца дымок.
За жыццё ты нямала
Пабачыў дымоў
Ад палаючых вёсак
І гарадоў.
А цяпер паглядзі ты на дым той,
Які
Так ласкава вітае
Празрысты блакіт.
Усяляю ў дом гэты
Шчасця я шмат —
Для малых,
Для дзядоў,
Для прыгожых дзяўчат.
Веру:
Будзе яго ведаць кожны куток,
Калі мірна віецца
Над хатай дымок.

**Марыя ШАЎЧОНАК**
(5 курс аддз. беларускай мовы і літаратуры)

* * *

*Пытальнікам цені вячэрнія*
*Уздрыгваюць на асфальце.*
*У вечным сваім вярчэнні*
*Зямля, нібы ў ціхім вальсе,*
*Плыве і нідзе не спыніцца*
*Ні днём і ні ноччу сіняю.*
*Няўжо ёй зусім абыякава*
*Навокал усё вось гэтае?*
*Яе называюць яблыкам*
*З галін усяго Сусвету.*
*А хіба адно жыццё ёй*
*Аддалі свае героі?*
*Няўжо ёй ніякай справы,*
*Што ты мне глядзіш у вочы*
*І позіркам шчырым расплавіць*
*Трывогу і крыўду хочаш,*
*Прымусіць мяне паверыць,*
*Што вечар спакойны вельмі?*
*Да сонца цягнуцца рукі*
*Ад мазалёў гарачыя,*
*А некаму так і рупіць*
*Абняць іх агнём палаючым*
*І тых, хто са мною поплеч,*
*Ператварыць у попел.*
*Я кропля на гэтым свеце,*
*Зямлі не спыню вярчэння,*
*Але ў тваім позірку светлым*
*Не бачу я засмучэння.*
*Зямлю утрымаюць плечы*
*Твае і мае, чалавечыя.*

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ**
(3 курс аддз. журналістыкі)

## З работы

Дарогай пыльнай, палявою,
Дзе трактары узбоч гудуць,
Прапахлы лугавой травою,
Дадому стомлены іду.
Гараць далоні, крок разважны.
Сыходзіць з твару гарачынь.
Каса прыціхлая паважна
Адпачывае на плячы.
А восень аж да хат дарогу
Імкнецца золатам услаць
...Не трэба шчасця мне другога,
Чым жыць з людзьмі
і працаваць.

**Аляксандр НІКАЛАЙЧАНКА**
(2 курс аддз. рускай мовы і літаратуры)

## Улетайте, скворцы

В трудный путь—
В добрый час!
Пусть вам солнце
Жар-птицею светит,
И в подарок по лучику
Каждому чтобы...
Улетайте смелей,
Чистым небом
Дорога вас встретит:
Я для вас запретил
Испытания атомной бомбы!..
Улетайте, скворцы...
А со мной ничего
Не случится,
Город мой никогда
Не запахнет
Руинною гарью...
Я деревьям хочу,
Чтобы каждому было
По птице,
Я девчонкам хочу,
Чтобы каждой —
По славному парню.

## Бессонница

*У других любимые*
*За дремучими полесьями,*
*Далеко-далеко*
*Где-то там, в горах...*
*Только ты со мной рядом,*
*Моя горячая песня,*
*В лютый холод*
*Незамерзающая на губах.*
*А завтра опять*
*Всю ночь глаза не закроются,*
*А завтра опять*
*За ночь целую пачку скурю,*
*Но тебе не скажу,*
*Что ты — моя бессонница,*
*Девушка,*
*Похожая на зарю.*

**Генадзь ДЗМІТРЫЕЎ**
(4 курс аддз. беларускай мовы і літаратуры)

## На будоўлі

«Баста, хлопцы! Давайце курнём.
Да канца яшчэ часу замнога!..»
І я падаю ў сон кулём,
Збіты з ног страшэннай знямогай.

...Ціха плёскае ў борт вада.
Разразаючы кілем ціну,
З сініх даляў, нібыта здань,
Выплывае мая брыганціна.

— Гэй, аркестр! Вясёлую грай!
Хлопцы, чэрці, пратрыце вочы —
Прынц я, прынц я, казачны Грэй,
А не проста падсобны рабочы;

Вунь, з русалкаваю касой,
Прыгажуня ў сукенацы белай:
Мне насустрач мая Асоль
Лёгкай ланню імчыць на бераг...

Толькі што гэта? Ён і тут
Гэты голас, да болю знаёмы:
— Падавай раствор, баламут!
Дасынаць будзеш потым, дома...

Ад сябе адганяў я сон.
Толькі ведаў я: прыйдзе гадзіна—
Я сустрэну цябе, Асоль,
Адшукаю сваю брыганціну.

**Уладзімір ДЗЮБА**
(2 курс аддз. беларускай мовы і літаратуры)

## *Канюшынка*

Маці, маці,
Ты мне напісала...
Ну скажы мне, калі не сакрэт,
Ці наўмысна, ці не, паклала
Канюшынінку у канверт.

Ён пахучы, узняў галоўку.
Так узняў, колькі мог узняць.
А я ўгледзеў — далёка, далёка
Ты з братамі грабеш сенажаць.

І, стаміўшыся, ціха, ля рэчкі,
Адарваўшыся ад грабель,
Прагна ловіш, як пахне грэчка,
Канюшына разносіць хмель.

Вось і пішаш, што дома ўсё добра.
І ва ўсім гэтым ласкі так шмат!
І ўжо п'е канюшынавы водар
Інтэрнат.



Цягнуць, пацягнуць... Фотажарт А. ГРАДЗЮШКІ.

**Эдуард ЗУБРЫЦКІ**
(4 курс аддз. беларускай мовы і літаратуры)

## Калі плачуць мужчыны

Так бывае, што плачуць мужчыны.
Толькі ж слёз іх не ўбачыш ніколі.
Адно стануць выразней маршчыны,
Адно сціснуцца зубы ад болю.
А прычыны? Прычын ёсць нямала,
Каб навек са спакоем расстацца.
Скажам, любая здрадзіла. Мала?
Скажам, жонка пакінула. Мала?
Лепш заплакаць, чым мёртвым астацца!
Бацька мой плакаў толькі аднойчы,
Калі вырваўся цудам з Дахаў,
Калі стукаўся майскаю ноччу
У дзверы роднай абпаленай хаты.
Больш ад радасці плачуць мужчыны.
Ды не плачуць ад гора ніколі.
Адно стануць выразней маршчыны,
Адно сціснуцца зубы ад болю...

**Міхась ГУБЕРНАТАРАЎ**
(1 курс аддз. беларускай мовы і літаратуры)

* * *

З васількоў жытнёвых і пралесак
І з тугога коласа ў палях,
З матылькоў асмужанага бэзу
Ты, кашуля, выткана мая.
З ніў шаўковых залатога рання,
Што трымціць так ласкава ад рос.
І з усмешак першага кахання,
Што ў душы я горача пранёс.
Пекната зямлі маёй радзімай,
Мне здаецца, выткана на ёй.
Васількамі—сінімі вачыма —
Ты квітнееш летам і зімой.

## Памяці Міколы Сурначова

Ён упаў у ранішнюю просінь.
Біла помста мужная з вачэй.
Як медсёстры, белыя бярозы
Да яго хіліліся грудзей.
Потым ночка выплакала росы,
Быццам маці роднага яго.
На лістоце залатая восень
Запаліла вечнасці агонь.

**Андрэй ЮДЧЫЦ**
(2 курс аддз. журналістыкі)

## Листопад

*Подметают листья*
*Под клёнами...*
*А зачем подметать*
*Красу?*
*Пусть берут её*
*Руки влюблённые*
*И вплетают*
*Девчонке*
*В косу...*

**Галіна ПАНЬКО**
(1 курс аддз. беларускай мовы і літаратуры)

## Шафёр

*Кожны дзень ля хаты*
*Едзе на машыне*
*Хлопец зухаваты,*
*Малады шафёр.*
*Кожны дзень сігналіць*
*Пад акном дзяўчыны,*
*Каб хоць на хвіліну*
*Выбегла на двор.*
*Ой, на двор, ой, на двор*
*Кліча дзеўчыну шафёр.*
*А яна употай*
*Гляне ў акенца:*
*Устрывожыў сэрца*
*Малады шафёр.*
*Заняла б з ахвотай*
*У кабіне месца,*
*Каб імчацца разам*
*Хоць да самых зор.*
*Хоць да зор, хоць да зор,*
*Толькі б побач быў шафёр!..*

**Леанід ДАЙНЕКА**
(2 курс аддз. журналістыкі)

## *Журавли*

*Когда в поту промок до нитки,*
*их различишь в любой дали.*
*Стоят, как мирные зенитки,*
*в российских сёлах журавли.*

*Стоят, как добрая награда*
*за трудный путь в июльский день.*
*И словно звонкие снаряды,*
*несутся вёдра вниз к воде.*

*Гремите, вёдра: пусть всё злее*
*горячий пот бежит ко лбу.*
*Я пью. Я снова молодею*
*под вашу мирную пальбу.*

**Калектыў выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў матэматычнага факультэта выказвае глыбокае спачуванне загадчыку кафедры тэарэтычнай механікі дацэнту ЧАПІНОГУ М. М. з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці маці.**

Рэдактар М. ЮСЬКА.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа. АТ 02410. Тыр. 2000. Зак. 3432.